Слова для Жыцця (204)

Аўтар: Рэдакцыя
08.03.2020 00:00

Папа Францішак

Вялікі пост – гэта час, каб выйсці на пустыню… Час, які трэба прысвяціць здаровай экалогіі душы, навядзенню парадку ў ёй. Мы імкнёмся да тысяч розных рэчаў, якія здаюцца нам важнымі, а на самой справе такімі не з’яўляюцца. […] Пасціць – значыць быць здольнымі адмаўляцца ад пустога, непатрэбнага, імкнуцца да важнага. Пасціць – не значыць сесці на дыету, але цягнуцца да істотнага, шукаць прыгажосці ў больш простым жыцці. Увойдзем у пустыню разам з Езусам, і зможам выйсці з яе, смакуючы Пасху, сілу Божай любові, якая абнаўляе жыццё. З намі адбудзецца тое ж, што і з пустынямі, якія вясной пачынаюць квітнець, нечакана даючы “з нічога” прарасці пупышкам і раслінам. Будзем з адвагай ісці за Езусам: з Ім нашы пустыні расквітнеюць.

Фрагмент прамовы падчас агульнай аўдыенцыі ў Ватыкане, 26.02.2020

Кс. абп Тадэвуш Кандрусевіч

Пост – своеасаблівы трэнінг для душы, які нясе надзею, што калі хтосьці можа абмежаваць сябе ў добрай рэчы, то здолее адмовіцца ад недазволеных і дрэнных прапаноў. Маецца на ўвазе панаванне над сабой і падпарадкаванне цела духу. […] Таму

мы павінны глядзець на пост не як на “дыету”, што ў некаторыя дні не ямо мяса, але як на магчымасць навучыцца прынцыпам цнатлівага жыцця: сказаць “не”, калі нельга, і сказаць “так”, калі трэба. Гэта азначае не пускаць усё на самацёк, а кантраляваць сябе. Фрагмент Пастырскага паслання на Вялікі пост 2020

Кс. бп Аляксандр Кашкевіч

“У час Вялікага посту мы павінны маліцца, павінны намагацца маліцца больш; шукаць час і месца для малітвы. Менавіта малітва, перш за ўсё, пасадзейнічае таму, каб пазбавіцца абыякавасці, стаць чулымі да спраў Бога і душы. Малітва выхоўвае таксама наша сумленне, а Вялікі пост з’яўляецца часам асабліва спрыяльным да абуджэння і выхавання сумлення. Касцёл нагадвае акурат у гэты перыяд пра моцную неабходнасць сакраментальнай споведзі, каб мы ўсе маглі перажываць уваскрасенне Хрыста не толькі ў літургіі, але таксама ва ўласнай душы” (Ян Павел II, 1979 г.). Няхай гэтыя словы вялікага Пантыфіка дапамогуць нам плённа перажыць час велікапоснага пакаяння і навяртання! Фрагмент Пастырскага ліста на I Нядзелю Вялікага посту 2020